**Матэленак, Л.** Маскоўскі пагранатрад... у Таджыкістане / Л. Матэленак // Міёрскія навіны. — 2015. — 14 лют. — С. 3.

**МАСКОЎСКІ ПАГРАНАТРАД... У ТАДЖЫКІСТАНЕ**

*У «дзембельскім» альбоме міярчаніна Міхаіла Міхайлавіча Апалькі яго здымкі і саслужыўцаў на фоне танкаў, машын залпавага агню, верталётаў, рознай іншай тэхнікі і зброі, а яшчэ гор. І без тлумачэнняў зразумела, што яны адлюстроўваюць армейскія будні ў Афганістане. Толькі неяк дзіўна пачуць, што наш зямляк служыў у Маскоўскім пагранічным атрадзе, які, нягледзячы на гучную назву, базіраваўся і нават цяпер знаходзіцца ў Таджыкістане, на мяжы з Афганістанам. Але што гэта значыла для беларускага хлопца?*





Міхаіл нарадзіўся ў Новым Пагосце ў 1969 годзе, і цяпер бацькоўская хата стаіць на вуліцы Купчалёўскай, што вядзе да чыгуначнага прыпынку Зоры. Закончыў дзесяцігодку, на хвалі юнацкага рамантызму вырашыў паступаць у Калінінградскае ваеннае вучылічша, але строгія армейскія парадкі адразу не спадабаліся вясковаму хлопцу. Так апынуўся ў Віцебскім радыётэхнічным вучылішчы. Там атрымаў спецыяльнасць электраманцёра па рамонце і эксплуатацыі прамысловага электраабсталявання. І нават паспеў колькі месяцаў папрацаваць на Віцебскім тэлезаводзе. Але настаў час прызыву на тэрміновую ваенную службу. У гарадскі ваенкамат з'явіўся з камсамольскай пуцёўкай стаць пагранічнікам. Пажаданне было рэалізавана.

Тады, а ішоў 1987 год, у далёкую Кулябскую вобласць Таджыкістана з Віцебшчыны накіравалі 70 юнакоў, «нашых» сярод іх было толькі двое – Міхаіл Апалька з Новага Пагоста і Уладзімір Буглак з Міёр. Усё ж ехаць поездам да Душанбэ стала весялей. А там аўтобусамі праз нябачаныя раней горныя перавалы трапілі ў Гісар, непасрэдна ў размяшчэнне пагранатрада. Разам і прайшлі месячны курс маладога байца, нават атрымалі размеркаванне ў гранатамётчыкі. Відаць, той пачатак для Уладзіміра стаў добрым стартам, бо потым ён даслужыўся да міліцэйскага палкоўніка.

Што да Міхаіла, то камандаванне, відаць, улічыла яго знаёмства з электра- і радыёабсталяваннем і з роты сувязі накіравала ў спецыяльную разведшколу. Там за калючай агароджай для 60 курсантаў парадкі былі больш жорсткія, чым на турэмнай зоне: з раніцы пасля пад'ёму крос на 3 кіламетры, потым заняткі па вывучэнні апаратуры сувязі, азбукі Морзе, афганскай мовы і розных спецдысцыплін да 15.00, пазней – беглі яшчэ на 5–8 км, поўзалі, хадзілі з грузам за плячыма па гарах... І так штодзень на працягу чатырох месяцаў.

Пра мову трэба сказаць асобна. Справа ў тым, што ў Афганістане дзве дзяржаўныя мовы і дзясяткі племянных. Пушту бліжэй да ўзбецкай і распаўсюджана пераважна ў высакагорных раёнах, а вось на дары размаўляюць жыхары далін. Яго і вывучалі ў разведшколе пад кіраўніцтвам сяржанта – студэнта Душанбінскага ўніверсітэта, ды так, каб разумець і размаўляць. Каму не хапала старання, «падахвочвалі» нарадам без чаргі. І цяпер можна паразмаўляць з Міхаілам Міхайлавічам на дары, ён ёй валодае значна лепш, чым нямецкай, якую некалькі гадоў асвойваў у

дзесяцігодцы. Мне хапіла з першага разу запомніць толькі адну фразу, якая не патрабуе перакладу: салям алейкум.

А тады пасля спецвучобы Міхаіл не затрымаўся ў атрадзе, разам з іншымі воінамі яго на верталёце перакінулі «на кропку» на афганскай тэрыторыі ля горада Рустак. Гэта ў пэўнай ступені ўмацаваны агнявымі кропкамі ваенны гарадок, акружаны калючым дротам з сігнальнымі ракетамі. У ім размяшчапася па 250–300 салдат манёўранай групы з тэхнікай, неабходнай для вядзення баявых аперацый. У іх Міхаіл не ўдзельнічаў, хаця боезапас з патронаў і гранат заўсёды трымаў пад рукой. Яго невялікае падраздзяленне з афіцэра, прапаршчыка і 4 салдат, якія папарна дзяжурылі ля радыёпрыёмнікаў круглыя суткі, займалася радыёразведкай у замацаваным раёне. Гэта азначае, што яны перахоплівалі і запісвалі на магнітафон усе перамовы «духаў», павінны былі ведаць іх пазыўныя, галасы камандзіраў і радыстаў, разумець сутнасць сказанага з прывязкай да канкрэтнай мясцовасці і пра ўсё насцярожвальнае неадкладна паведамляць у разведаддзел. Калі ўмовы не дазвалялі запеленгаваць вельмі патрэбны перадатчык, амаль з пудовай рацыяй іх на верталёце адвозілі на больш высокія горы. Тады марзянку перахоплівалі нават з Пакістана. Парадаваліся, калі груваструю айчынную апаратуру замянілі на кампактную японскую.

Падтрымлівалі сувязь з агентурай, якая паведамляла важныя звесткі па адпаведных пазыўных у дакладна вызначаны час.

Так, траплялі пад абстрэлы. Але і падтрымку нашым войскам аказвалі вялікую, здаралася, нават карэкціравалі артылерыю, калі з радыёперамоў «духаў» даведваліся, што свае снарады разрываюцца не там, дзе трэба.

Ці было страшна? Было, асабліва спачатку, але чалавек да ўсяго прывыкае. Навучыўся хутка вызначаць адкуль страляюць, не ленаваўся «кланяцца» кулям. Для сваёй апаратуры пабудавалі зямлянку. Потым яе пашырылі, выкарыстаўшы скрынкі з-пад рэактыўных снарадаў. Пад зямлёй больш надзейна і цёпла, чым у брэзентавай палатцы. Ды і танк, БТР побач.

Зведаў як гэта непрыемна, калі на кропку не можа своечасова прыляцець верталёт. Тады даводзілася пячы на «буржуйцы» аладкі з рэшткаў мукі, запіваць іх чаем з вярблюджых калючак.

М. М. Апалька не даслужыў да вызначаных двух гадоў толькі пяць дзён, у ліку першай, «нулявой» партыі сярод лепшых байцоў быў звольнены ў запас. Адбылося гэта 20 лістапада 1989 года. Вось тады і апрануў у першы раз парадную форму, прымацаваў да яе побач са знакамі выдатніка пагранвойск першай ступені медалі «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай граніцы», «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», атрыманыя ў пачатку таго ж 89-га. Падмацаваннем для іх стала Грамата Вярхоўнага Савета СССР воіну-інтэрнацыяналісту ад 28.12.1988-га.

А потым была знаёмая дарога аўтобусам да Душанбэ і самалётам – дадому.

Працаваў электраманцёрам у Шаркаўшчынскім ДБУ і завочна вучыўся ў тэхнікуме. Ганарыцца, што адзін зманціраваў усё электраабсталяванне асфальтабетоннага завода. Займаў пасады намесніка дырэктара кансервавага завода ў суседнім райцэнтры і намесніка райнарыхтканторы ў Міёрах. Спраўляўся з абавязкамі ў ахове і энерганаглядзе, пазнаёміўся з вытворчасцю камбікармоў. Апошнім часам пакалясіў на вялікагрузнай машыне па дарогах не толькі Беларусі і Расіі, але і Літвы, Польшчы, Германіі, Галандыі, Бельгіі, Люксембурга Іспаніі і іншых краін. Быў здзіўлены цыганскім мікрараёнам з тарных скрынак ледзь не ў цэнтры Парыжа, засмечанымі вуліцамі некаторых гарадкоў Іспаніі.

І ўсё ж людзі ў Заходняй Еўропе жывуць багата, бо шмат працуюць і эканомяць літаральна на ўсім. Гэтаму ў іх і нам не грэх павучыцца

– Толькі дзе б ні быў цягне дадому, да родных мясцін, – сцвярджае Міхаіл Міхайлавіч. – А тут сям'я, утульны катэдж, паўсюль зразумелая мова. І мноства планаў па далейшым уладкаванні жыцця.

**Леанід МАТЭЛЕНАК.**

**На здымках:** *М.М Апалька*

*цяпер у сваім доме*

*і падчас службы ў Афганістане*